УДК 908(476)

# ЗАГАДКІ ПАЛЕСКАГА КРАЮ

***І. Я. Сільчанка*** (Магілёўскі інстытут МУС РБ)
Навук. кір. ***А. М. Шубадзёрава,***
канд. філал. навук, дацэнт

Існуюць навуковыя меркаванні, што на тэрыторыі Беларусі некалькі стагоддзяў таму існавала мора, якое называлі па-рознаму. Вядома, што размяшчалася яно на месцы цяперашняга Палесся. Аб існаванні мора можна меркаваць па захаваных старажытных картах Я. Гастальдзі, С. Мюнстэра, К. Вопеля, а таксама па розных знаходках марскога паходжання ў месцах, не ўласцівых ім. Такімі знаходкамі з'яўляюцца шматлікія якары і патанулыя караблі каля Прыпяці, якія былі знойдзены далёка ад разліву ракі.

На малюнку саміх карт мора звалася Сармацкім. Гэтая назва з'яўляецца ўмоўнай, бо ў той час Усходнюю Еўропу называлі Сарматыяй. Карты Мюнстэра і Вопеля сведчаць аб тым, што з берагоў мора выцякалі такія рэкі, як Ясельда, Лясная і Нараў. Праўда, на картах была пазначана назва «Sarmatica palus», назва «palus» (балота) ужо тады ўказвала на "спецыфічнасць" мора, якое забалочвалася і перасыхала. Дадзеныя працэсы навукоўцы тлумачаць узняццем Балтыйскай літасфернай пліты, якая садзейнічала паніжэнню ўзроўню вады ў вадаёмах.

Яшчэ адным доказам існавання мора з'яўляюцца запісы вядомых даследчыкаў літоўскіх і беларускіх старажытнасцей, адным з якіх з'яўляўся Адам Кіркор. Ён пісаў: «Тысячагоддзі аддзяляюць нас ад той эпохі, калі ўся даліна Прыпяці была таксама залітая вадою – морам Герадота» [1, с. 329]. А. Кіркор даў такую назву беларускаму мору, бо менавіта Герадот першым згадаў пра яго яшчэ 2500 гадоў таму.

Сучасны беларускі даследчык дадзенай тэмы А. Бутэвіч у газеце «Звязда» (2001, №90-91) знаходзіць доказы існавання мора ва ўнікальным клімаце і рэдкіх цеплалюбівых раслінах, якія характэрны толькі для тэрыторыі Палескага краю.

Знікненне беларускага мора, на думку даследчыкаў, абумоўлена даволі простай прычынай. Мора ўтварылася ў выніку адыходу леднікоў, у выніку чаго на тэрыторыі Палесся ў нізіне сабралася шмат вады. Вада ў моры хутка выпаралася, а прыток вады з рэк, якія ўпадалі ў мора, быў недастатковы. У выніку ад вялізнага мора засталіся балоты і азёры, якія сілкуюцца ад рэк, якія ўпадаюць у іх.

**Літаратура**

1. Живописная Россия / под общей редакцией П. П. Семенова. – Т. 3. Ч. 1: Литовское Полесье. Ч. 2. Белорусское Полесье. – СПб., 1882 (факсімільнае перавыд. : Мінск, 1993). – 554 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова